

Уладзімір ГАЎРЫЛОВІЧ

# КРАІНА ВАЛОДЗЬКАВА*

*Згадкі маленства*

...Ужо дарослым, ажыццявіўшы многія свае мары дзяцінства, такога няпростага і нялёгкага, якое як і для большасці хлапчукоў і дзяўчынак тых далёкіх 60-х гадоў, калі нястача адчувалася паўсюль — яшчэ давала знаць пра сябе вайна, калі просты чалавек адчуваў сябе залежным ад шмат чаго дурнотнага, што абрушвалася на яго «зверху», далёкага і свайго, мясцовага, ён не мог і не можа зразумець, здавалася б, самага простага: чаму было так... З ім, ягонымі сябрамі, бацькамі, аднавяскоўцамі... І, часам паглыбляючыся памяццю ў далёкае мінулае, бачачы там усё гэта, адчувае святло і дабрыню родных і блізкіх яму людзей, а таксама знаёмых і незнаёмых, якія ўсялялі веру ў справядлівасць жыцця...

У Валодзькі свята. Яму толькі што падарылі драўлянага цацачнага коніка: белы ў шэрыя яблыкі, з намаляванымі сядлом і аброццю і сапраўднымі чырвонымі лейцамі-ланцужкамі. Конік стаіць на дошчачцы з колцамі і вельмі

---

***Гаўрыловіч Уладзімір Мікалаевіч** нарадзіўся 30 жніўня 1967 года ў вёсцы Вятчын Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Скончыў філалагічны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага (1991). Працаваў настаўнікам, дырэктарам Бялёўскай СШ у Жыткавіцкім раёне, галоўным рэдактарам раённай газеты «Новае Палессе» (Жыткавічы), гарадской — «Гомельскія ведамасці» (Гомель). Цяпер — старшыня Гомельскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі».*

*Аўтар кніг прозы «Споднія яблыкі» (1999), «Глыбокія карані» (2001), «На мяжы» (2003), «Плата за каханне» (2007), «Забранае шчасце» (2007),«Анёлак мой, Анёлак» (2013), «Цяпло маладзіка» (2014) і публіцыстыкі «...Дзе над горадам лунаюць буслы» (2000), «Крокі па роднай зямлі» (2005), «Запрашэнне» (Швейцарыя, 2007). Творы выдаваліся ў Расіі, Украіне, Германіі, Швецыі.*

*Лаўрэат Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «Лепшы твор 2007 года ў галіне прозы» за кнігу «Плата за каханне», літаратурнай прэміі памяці Мікалая Мельнікава (Расія, 2009), Міжнароднай літаратурнай прэміі Баяна (Расія, 2011), літаратурнай прэміі імя У. І. Нарбута (Украіна, 2014) і іншых прэстыжных узнагарод.*

---

* Часопісны варыянт.

хутка коціцца па падлозе, калі яго цягнеш за лейцы. Такога цуду не тое, што Валодзька, але і сястрычкі, мама і тата, бабуля і дзядуля ніколі не бачылі.

Коніка яму падаравалі незнаёмыя Валодзьку дзядзька і цётка. Яны яшчэ ўчора прыехалі з горада Ленінграда да татавай мамы, бабулі Вольгі, якая жыла з дзедам Ціхонам у тым канцы вёскі — нейкая іхняя радня. А сёння гэтыя дзядзька і цётка прыйшлі ў госці да Валодзькавых бацькоў і падарылі яму драўлянага коніка. Такога коніка няма ні ў кога з яго сяброў.

— Ну, што ты, сынок? Падарылі, дык бяжы на вуліцу, выгульвай свайго прыгажуна, — сказала мама Жэня, і запрасіла гасцей да стала. І Валодзька схапіў абедзвюма ручкамі дзівосную цацку і выбег на вуліцу: толькі яго і бачылі ў хаце.

А на вуліцы горача. Лета — сама гуляць! Збегшы з ганачка, Валодзька асцярожна паставіў коніка на зямлю, стаў перад ім на каленкі, ласкава пагладзіў па грыўцы, па спіне, усміхнуўся яму і нават падміргнуў. І, як падалося Валодзьку, конік таксама падміргнуў яму, свайму гаспадару, а ад гэтага ў яго ажно закружылася галава — ён жа як сапраўдны конік, жывы, калі ўсё разумее… Валодзька ўскочыў на коніка, абняў яго, і падумаў: каму ж пахваліцца сваёй радасцю?.. І адразу знайшоў каму — бабулі Ганне. Вунь яна, на сваім падворку, корміць куранят.

Трэба сказаць, што падворак Валодзькавых бацькоў і падворак бабулі Ганны і дзядулі Ігната — адзін вялікі пляц на дзве гаспадаркі. З аднаго боку яго хата і пабудовы бацькоў, з другога — старых.

Спачатку Валодзька сумеўся — і як гэта бабуля не заўважае яго? З-за куранят? Мабыць так, яны ж вывеліся некалькі дзён таму. Спачатку бабуля трымала іх з іхняй маці курыцай Чарняўкай на кухні ў сваёй хаце, — ля печы дзядуля дошкамі адбіў ім невялікую загарадку, і вось, бачаш, вынесла на падворак.

Валодзька любіў назіраць за жаўтаротымі птушанятамі і часта прасіў бабулю, каб яна дазволіла яму пакарміць куранят і іх пражэрлівую маму. Кураняты гарнуліся да яго, а Чарняўка, калі ён працягваў руку, каб высыпаць проса на вечка з пасылачнай скрыні, усё наважвалася дзеўбануць яго. І дзеўбанула такі аднойчы, ды так балюча, што Валодзька ледзь стрымаў слёзы!..

Валодзька вырашыў бабулі першай паказаць свайго каня. Ён пацягнуў за сабой коніка, пабег так шпарка да бабулі, што не заўважыў, як пад колцамі яго падарунка раптам апынулася адно кураня. Бабуля войкнула, курыца закудахкала, а Валодзька збянтэжыўся, калі ўбачыў, што яго любімае пярэстае кураня знерухомела, выцягнула ножкі і адкінула галоўку.

— Ба... Я ж не бачыў Канапаціка... Ба, ён што... памёр? — захныкаў Валодзька.

— Папругай цябе, ёлупа, трэба добранька адлупцаваць, — бабуля паднялася з зэдліка, на якім сядзела каля ганка і падышла да Валодзькі. Яна нават не глянула на яго, нахілілася над кураняткам. І толькі хацела ўзяць яго ў рукі, як яно раптам расплюшчыла вочкі, ускочыла на ножкі і пабегла.

— Табе пашанцавала, падшыванец... — сказала, усміхнуўшыся, бабуля Ганна, і дадала: — Не лётай, як шалёны, па двары, вунь на выгане месца хапае!..

Не заўважыла… То хай, ён пабяжыць адсюль, а то яшчэ адлупцуе… І ён пабег па вуліцы, пацягнуў за сабой коніка да канцавой хаты, у якой жыла яго сяброўка Лорка з братам Колькам. Яны старэйшыя за Валодзьку, Лорка хутка ў школу пойдзе, а Коля зусім вялікі, але не крыўдзяць яго, сябруюць з ім.

Але дарэмна бегаў, іх дома не было, веснічкі зачынены. А калі бег назад, каля падворка старога Міхаля, іхняга суседа, зноў спалохаўся: той стаяў

каля сваіх веснічак і нядобра паглядаў на Валодзьку і яго коніка. Колькі бег Валодзька да свайго падворка, цягнучы за сабой яго, столькі адчуваў пякучы пагляд на спіне. А дома, крыху супакоіўшыся — маці і бацька былі на працы, а сястрычкі ў агародзе — усцягнуў коніка на ложак, абняў яго і знясілены заснуў…

* * *

Неяк дзядуля Ігнат і Валодзькаў тата Мікола прывялі на дзедаў двор сапраўднага каня. Валодзька ведаў, што яны паедуць на балота па сена, таму з самай раніцы круціўся каля дзедавай хаты, трымаючы за лейцы свайго неразлучнага сябра — белага скануна ў шэрыя яблыкі. З ім ён не расставаўся ні на дзень, куды б ні ішоў заўсёды цягнуў за сабой за чырвоныя лейцы-ланцужок.

Калі дзед Ігнат прынёс з сенцаў збрую і хамут, а бацька папраўляў вупраж, Валодзька ўжо быў ля калёс. Ён блытаўся пад нагамі ў дарослых, і тыя пачалі сварыцца на яго:

— Не таўчыся тут, ідзі да мамы і сясцёр! Замінаеш! — зазлаваў бацька і паклікаў маму.

Мама Жэня разам з Валодзькавымі сёстрамі Наташай і Нінкай на сваім падворку ў карыце мылі бялізну каля ганка. Быў у Валодзькі яшчэ і старэйшы брат Коля. Ён ужо заканчваў школу, летам рабіў у калгасе, і больш знаходзіўся ў татавых бацькоў, якія жылі на другім канцы вёскі. І занятыя сваім клопатам сюды хадзілі не часта, бо чамусьці не вельмі любілі Валодзькаву маму, яго і сястрычак.

Мама, выцершы аб фартух мокрыя рукі, падышла сюды, сказала:

— Ідзі дадому, сынок. Яны далёка паедуць, на прылесак, да балотца, там сена накасілі. Гэта далёка-далёка. Там шмат аваднёў, і табе туды нельга...

Мама ўзяла Валодзьку за ручку і павяла на свой падворак.

— Чаму нельга? Я аваднёў не баюся, — захныкаў ён.

— Ты замінаць будзеш, а ім працаваць трэба, каб нашым кароўкам — Зорцы і Лысцы — быў корм на зіму. Яны вельмі любяць сухое сена, таму і шмат малака даюць, а ты ж малачко любіш…

— А я ўсё адно хачу з імі! — Валодзька затупаў ножкамі.

— Аваднёў не баішся, а ваўкоў? Іх жа там, у лесе, шмат, — на дапамогу маме прыйшла старэйшая сястра Наташка. — Забыўся, Валодзька, якія яны страшныя?

Ваўкоў Валодзька баяўся. Сцішыўся. А сястрычка, склаўшы рукі ў трубачку, прыклала іх да сваіх вачэй:

— Вось з такімі вачышчамі! Ага…

Сястра была такой жа светлавалосай і канапатай, як і яе малодшы брат. Але старэйшай дзяўчынка была толькі для яго, Валодзькі, ёй было амаль дзесяць гадоў, і яна, калі ён яе не слухаўся, часта палохала яго ваўкамі: «Прыйдуць ноччу, забяруць неслуха».

— А ты не хлусіш? І тата з дзедам не ўратуюць? — на ўсякі выпадак перапытаў сястру Валодзька, не заўважыўшы, як мама Жэня чамусьці ўсміхнулася Наташцы, і тая адказала пераканаўча:

— Не хлушу.

— Ну, добра, не паеду, — пагадзіўся Валодзька і не стаў вырывацца з маміных рук, хаця ўсё ж з неахвотай пацягнуўся ў свой двор за ёй і сястрой. Напалоханы, ён нават забыўся пра свайго коніка, які сіратліва застаўся стаяць на дзедавым падворку.

— А ваўкі злосныя? Такія, як наш Тарзан?— пытаўся Валодзька. — Я яго баюся…

— Дурненькі, Тарзан зусім не злосны, ён добры сабака, і ніколі цябе не пакрыўдзіць. Ён толькі на чужых гаўкае... — засмяялася сястра.

— Так, сынок, Тарзан добры, а ваўкі кепскія. Таму ты сам і на ўзлесак, і на Бярознае не хадзі, а то пацягне цябе ў лес злосны воўк, і мы будзем плакаць...

Ён тут жа ўспомніў, як на Бярозным — вялікім лесе, які пачынаўся адразу за іх агародам — ён разам з бабуляй Ганнай хадзіў шукаць баравікі і рыжыкі і нікога не баяўся. З бабуляй не страшна, яна расказвае яму казкі, і ўсе звяры ў іх добрыя, акрамя ваўкоў. Валодзька аднойчы спытаў у яе, адкуль яна казкі ведае. Адказала, што ёй іх яе мама казала, а што і сама прыдумвае. І Валодзька, калі вырасце, будзе прыдумваць казкі, ды ўсім расказваць. Толькі і ваўкі там будуць добрыя…

— Я не пайду сам... — паабяцаў хлопчык.

І хутка пра страшных ваўкоў забыўся: у двары сёння было гэтулькі ўсяго цікавага.

* * *

Бацька з дзедам паехалі, так і не ўзяўшы з сабой Валодзьку. А ён сноўдаўся па сваім двары, з-за страху і крыўды на іх, што не ўзялі з сабой, нават забыўшыся на свайго коніка на дзедавым падворку. Ды і з сёстрамі забавіўся, якія мылі бялізну і развешвалі на двары на вяроўках, працягнутых ад плота да плота. І раптам на вуліцы пачуўся нейкі шум.

— Нашы едуць, — сказала мама.

Валодзька выбег да веснічак і ўбачыў неверагоднае: цэлы вялізны стог зеленавата-жоўтай сухой травы рухаўся па залітай яркім сонцам вуліцы — сляпіла вочы і каня ён не бачыў.

— Ма, глядзі! Што гэта?

— Нашы, сынок, прыехалі, кажу! — мама выпрасталася, трымаючы ў руках над карытам з каламутнай вадой Валодзькаву сарочку, выцерла потны лоб і загадала: — Будзь тут, гарэза! А то яшчэ пад калёсы падлезеш, раздушаць! Тата з дзедам сена разгрузяць, абедаць будзем...

Але як ні ўглядаўся Валодзька ў стог, што рухаўся сам па вуліцы, не бачыў дзе ж там «нашы».

Ён быццам і не пачуў апошніх мамчыных слоў, сарваўся і пабег з двара на вуліцу. І ўжо ля шырокіх варот з жэрдак на дзедаў падворак убачыў, як, цяжка дыхаючы, не звярнуўшы на яго ўвагі цягне воз сена руды конь, а высока-высока, на самай версе воза, трымаючы лейцы, сядзіць дзед Ігнат і заварочвае калёсы ў праём.

Вось яны павольна праехалі ля Валодзькі, накіраваліся да пуні, і толькі тады ён заўважыў бацьку. Ён, аказваецца, крочыў наперадзе калёс і, мабыць, таксама не бачыў яго. А дзядуля, седзячы на возе, нацягнуў лейцы і сказаў:

— Но, Лысы!

Калёсы ледзь сунуліся па вузкім пляцы далей, Валодзька стаяў амаль прыціснуўшыся да сцяны, глядзеў, як дзядуля ўвішна ўхіляецца ад тонкіх галінак яблынь, што раслі адразу за плотам. І раптам успомніў: недзе там, дзе зараз рыпяць калёсы застаўся ягоны маленькі сябра — белы конік у шэрыя яблыкі. У галаве пранеслася страшная думка: а раптам бабуля не схавала яго?

— Мой конь! Мой конік! — жудасна закрычаў Валодзька і кінуўся б пад калёсы, каб яго не перахапіў бацька.

На крык са свайго падворка кінуліся мама і сёстры, рушыла з агарода бабуля, дзядуля закрычаў: «Стой, Лысы!», але было позна… Пад коламі пачуўся балючы сухі трэск…

Валодзька заплюшчыў вочкі, закрыў іх рукамі, і працягваў паўтараць збялелымі вуснамі:

— Мой конік... Мой конік... Мой конік...

Калі потым калёсы праехалі далей і спыніліся ля пуні, Валодзька адважыўся расплюшчыць вочы і зноў закрычаў, заплакаў з такім горкім адчаем, якога потым не адчуваў ніколі ў сваім жыцці: на зямлі ляжаў раструшчаны яго конік…

Першым адгукнуўся бацька, сплюнуўшы ў бок, раздражнёна сказаў:

— Сам вінаваты. Трэба было глядзець за сваім канём, не я ж яго тут кінуў!

Валодзьку хацела забраць маці, але бабуля не дала:

— Ідзі, рабі сваё... Я з ім пабуду.

Яна нахілілася над ім, і хоць ёй было цяжка, бо хлопчык быў ужо цяжкаваты, падняла яго і панесла няўцешнага ў хату, прыгаворваючы:

— Не плач, дуранько! Шкада і мне, і маме, усім шкада твайго коніка, але што паробіш... Я табе, галубок, наліснічка дастану з печкі, ён жа такі смачны, не паверыш... Не плач, родненькі!

Але Валодзька быў няўцешны. Ён яшчэ доўга плакаў, седзячы на каленях у сваёй любай бабулі. А яна ўвесь час яму штосьці распавядала… Хлопчыку было крыўдна і горка. Ён злаваўся то на дзеда, то на бацьку, а потым чамусьці на маму і на сясцёр, якія ж, калі разабрацца, сапраўды ні ў чым не былі вінаватыя. Ён злаваўся нават на тых добрых дзядзьку і цётку з далёкага, невядомага, але, як казалі, такога вялікага і прыгожага горада Ленінграда: навошта яны прывезлі гэтага прыгажуна-коніка яму ў падарунак? Не прывезлі б, — урэшце засынаючы знямоглы на мяккіх бабіных руках, думаў Валодзька, тады б і не было бяды…

* * *

Ён прачнуўся на ложку і заўважыў, што ў хаце нікога няма. Не мог зразумець, як у ім аказаўся: здаецца ж быў на руках у бабулі… Выйшаў з хаты — таксама нідзе нікога няма. Ні каня, ні сена. Няма нікога і на іхнім двары. Падумаў, мабыць, мама з сястрычкамі пайшла на ферму, дзе яна даглядае цялят, — ужо вечарэе, а дзед з бацькам косяць траву на ўзлеску — збіраліся ж, як спадзе спякота. Бабуля, мабыць, у градах. Глянуў праз агароджу туды — так і ёсць, там яна. І не адна. Побач з ёй палола грады яе родная сястра бабуля Тэкля, якая жыла ў тым канцы вёскі, што называўся Мішны. Яна часта прыходзіла да бабулі Ганны, каб дапамагчы сястры. Дзядуля Ігнат засяваў шмат зямлі, і бабуля Вольга дапамагала бабулі Ганне абрабляць яе.

Валодзька хацеў пайсці да іх, але раптам каля дрывотні ўбачыў зламаны капыток свайго коніка. А побач на кучы смецця ляжаў сам раструшчаны конік. Валодзька ўявіў, як было балюча коніку, калі на яго ўз'ехалі калёсы і заплакаў. Плакаў ён доўга, яму самому ўнутры балела, быццам гэта па ім ехалі цяжкія калёсы з вялікім стогам сена… Калі ж выплакаўшыся крыху супакоіўся, кулачком прыгразіў бацьку і дзеду: толькі пачакайце, вось падрасту, я вам адпомшчу за свайго коніка! А пасля падумаў: а хто ж пакінуў сярод двара яго?.. Я, я і вінаваты… І яшчэ калі конік на сметніцы, то яго потым спаляць у печы… Не, такога ён не дазволіць!

На дзедавым паселішчы, у куце дрывотні, дзе захоўвалася шмат чаго цікавага і куды Валодзьку дарослыя не дапускалі, бо дзед баяўся, каб ён аб што ні параніўся, стаяла маленькая рыдлёўка. Яе дзядуля часам даваў унуку, калі ўскопваў градкі ў агародчыку перад хатай. Валодзька і праўда зараз знайшоў яе там, узяў яе і рашуча пайшоў з ёй на вуліцу. Пад раскідзістым клёнам, што рос каля хаты, і які некалі пасадзіў ягоны старэйшы брат Коля, выкапаў неглыбокую шырокую ямачку.

Яма аказалася нават крыху бальшаватай. На дно ямы ён паклаў некалькі лістоў клёну, а затым, пагладзіўшы свайго сябра па ацалелай грыўцы, цяжка ўздыхнуўшы, апусціў яго ў яе. Потым накрыў лісцем, і цяжка ўздыхнуўшы, засыпаў яму і босымі ножкамі ўтаптаў маленькі грудок.

Ён не хацеў, каб хтосьці здагадаўся, дзе ён схаваў свайго сябра. Хлопчык ведаў адно: тут коніку будзе ляжаць лепш, чым на сметніцы, і чакаць, пакуль яго спаляць. Ды і будзе ён бачыць адсюль усё, што робіцца навокал. А Валодзька будзе кожны дзень прыходзіць сюды і размаўляць з ім…

Валодзька яшчэ ніколі не бачыў, як хаваюць людзей, якія паміраюць, але чуў, што іх закопваюць у зямлю. (Дарослыя, калі хто паміраў у вёсцы, не бралі яго з сабой на могілкі: не трэба…) Ён чуў, што потым родныя прыходзяць да магілкі і размаўляюць з тым, хто там пахаваны і ад гэтага таму лягчэй… Вось і ён…

Калі Валодзька прынёс лапату назад, на двары ўжо былі бабуля Ганна і бабуля Вольга.

— Што ты ёй рабіў? — спытала бабуля Ганна.

— Я пахаваў свайго сябра. Але гэта — вялікі сакрэт і...

— Ну, сакрэт дык сакрэт... — сказала бабуля. — Мый ручкі і пайшлі есці. Я цябе налісьнічкамі пачастую!

— Ура, я люблю налісьнікі! — закрычаў ён, не заўважаючы, што вочы ў бабулі туманяцца.

* * *

Неяк, нагуляўшыся з дзецьмі на вуліцы, Валодзька пабег дадому і ў веснічках свайго падворку твар у твар сустрэўся са старым Міхалем, які жыў амаль па-суседску з ягонымі бацькамі, і якога хлопчык вельмі баяўся, хоць той ніколі нічога дрэннага яму не зрабіў.

Стары, нядобра глянуўшы на яго, заспяшаўся да сваёй хаты. «Што яму ў нас было трэба? — падумаў Валодзька. — З ім жа ні тата, ні мама, ні дзед з бабай нават не размаўляюць, хаця і не сварацца». Толькі паспеў падумаць, як з гародчыка, там, дзе былі грады клубніц пачуў дзікае мяўканне, спалохаўся, а падбегшы бліжэй убачыў, што па баразне паўзе акрываўлены пярэста-чорны іхні коцік Барсік.

— Мам-а-а-а! — што ёсць моцы закрычаў Валодзька, і яшчэ больш спалохаўшыся.

— Што здарылася, сынок? — мама Жэня выбегла на ганак.

— Барсік... Барсік... У яго няма лапак... — крычаў Валодзька.

— Што ты выдумаў? — не паверыла мама, падбягаючы да сына.

— Я бачыў, я ведаю... Гэта дзед той… Міхаль… Ён толькі што з нашага двара сышоў. Гэта ён Барсіка…

Валодзька захлынаўся ад слёз, бачачы, як бедны скрываўлены Барсік скача на пярэдніх дзвюх лапках, цягнецца за хату, жудасна мяўкае.

Мама прытуліла Валодзьку да сябе, закрыла рукамі яму вочкі, мовіла:

— Бацька прыйдзе… Не плач, сынок, з Міхалём разбярэцца.

— А як жа Барсік жыць будзе? Яму ж балюча... без лапак?

— І як такіх людзей зямля трымае... — мама павяла сына ў хату, цалуючы яго і супакойваючы, не перастаючы плакаць...

Неўзабаве прыйшоў бацька. Мама распавяла яму пра бяду. Бацька доўга маўчаў, спахмурнеў, потым вылаяўся:

— Яму б самому рукі адсекчы!..

— Не чапай старога, Коля! Бог з ім. Але пагаварыць трэба. Нядобра так. Коцік — жывое стварэнне. Барсік паслухмяны. Можа, у сенцы да іх і залез, а Міхаль за гэта так пакараў, адсек заднія лапкі. Нядобры ён чалавек, ой, нядобры...

— А кот дзе? — пацікавіўся бацька.

— Дзесьці ў садзе. Баялася ў рукі ўзяць. Пашукай. А то яшчэ куды спаўзе і сканае.

Але Барсік нікуды ад свайго паселішча не змог адпаўзці. Ён пралез у адтуліны дубовага падмурка, і пад падлогай хаты ад болю то ціха, то гучна мяўкаў. Дастаць яго адтуль было немагчыма, і колькі ні звалі — не вылазіў. У хаце не спалі начамі, не ведаючы, як яму дапамагчы. Нарэшце бацька з дзедам сарвалі падлогу і дасталі ката. Ён паміраў… Валодзьку мама забрала на ферму, каб ён не бачыў, як бацька аднёс Барсіка ў лес…

З той пары і пачаліся сніцца Валодзьку кашмары. Яму трызніліся пачвары з барадамі, падобныя на іх суседа Міхаля, пагражалі хлапчуку… (Толькі ж за што?) Часта па начах з-пад падлогі чулася жаласлівае мяўканне Барсіка, якому ўжо ніхто нічым не мог дапамагчы… Валодзька крычаў у сне, будзячы ўсіх. І мама, якая так цяжка цэлы дзень працавала на ферме, потым абрабляла ўчастак буракоў на калгасным полі, а яшчэ да цёмнага палола і свае градкі, брала яго, як маленькага, на рукі, і несла да сваёй маці, Валодзькавай бабулі Ганны, якая ўмела загаворваць ваду дзецям ад перапуду. Праз нейкі час ці яна вылечыла яго, ці само мінулася, але Валодзька акрыяў. Праўда, тое, што здарылася з Барсікам, своеасаблівымі балючымі драпінамі засталося на душы назаўсёды…

А неўзабаве старога Міхаля і яго жонкі не стала на свеце. З часам іх хата асунулася, струхнела, двор хутка зарос слівамі, плот заваліўся, і ніхто з вяскоўцаў не прыходзіў у іхняе селішча. А Валодзька, накіроўваючыся гуляць да Лоркі, прабягаючы паўз двор Міхаля адварочваўся: яму доўга здавалася, што за ім з двара сочыць злосны дзед…

І зараз, калі ўжо дарослы Валодзя прыязджае ў родную вёску і ідзе да свайго дому паўз колішняе селішча Міхаля — ад былой хаты і пабудоў і знаку не засталося, хіба што ўтравелы грудок, яму здаецца, што ён чуе як нема крычыць Барсік, і бачыцца маці, якая разам з ім, сынам, плача, не ведаючы як і чым дапамагчы скалечанаму коціку.

* * *

Усё лета Валодзька, кожны дзень ідучы з хаты раніцою на вуліцу гуляць, наведваў пад клёнам пахаванага свайго драўлянага коніка. Ён глядзеў, каб нікога побач не было і тады размаўляў з ім. Ён казаў коніку, дзе ўчора быў і што рабіў, і што будзе рабіць сёння. Вядома, конік нічога яму не адказваў, але Валодзьку галоўнае было, што ягоны драўляны сябар чуе яго і бачыць. Расказваючы пра свае справы бліжэй да восені — падала ўжо жоўтае лісце з клёна, Валодзька неяк пахваліўся яму, што ведае літары і іх таямніцу — літа-

ры складаюцца ў словы, а словы расказваюць пра ўсё, што было, ёсць і будзе навокал. Пра зіму, вясну, лета, восень, пра зайцоў і ваўкоў, пра хлопчыкаў і дзяўчынак… Разгадваць таямніцу літар Валодзьку навучылі сястрычкі. Сказаў Валодзька коніку і пра тое, што калі ён добра разгадае таямніцу літар, сам пачне пісаць з іх словы і раскажа ўсім, усім дзецям і дарослым пра свайго сябра коніка, пра коціка, якога знявечыў Міхаль, пра сябе, пра тату і маму, пра сястрычак і брата, пра бабулю і дзядулю, пра ўсё, што ўжо ведае. А галоўнае — пра тое, што ніхто не павінен нікога крыўдзіць: ні дзеці, ні дарослыя… Расказваў, а ў галаве круціліся словы, якія яму для гэтага спатрэбяцца…

Выгаварыўшыся, Валодзька бег гуляць да Лоркі і яе брацікa, і звычайна быў з імі амаль цэлы дзень — мама была на ферме, сястрычкі дапамагалі ёй, тата на працы ў лесе, а бабуля з дзядулем корпаліся на агародзе…

Аднойчы ўвечары мама сказала:

— Дзяўчаткі, трэба нашага Валодзьку адмыць. Праз два дні будзе 1 верасня, а заўтра, 30 жніўня, яму сем гадоў. Вы яго возьмеце з сабой у школу…

Школу Валодзька бачыў раней шмат разоў. Цагляны двухпавярховы будынак размяшчаўся далекавата ад іхняй вёскі, у іншай, якраз насупраць фермы, на якой мама працавала даглядчыцай цялят.

У школу ён хацеў і з радасцю дазволіў «адмыць» сябе, а вечарам, кладучыся спаць, думаў пра тое, як яго будзе хваліць настаўніца за тое, што ён ужо ведае таямніцу літар, умее чытаць па складах, і, як кажуць сястрычкі, будзе першым вучнем у класе.

* * *

Клас, у які адразу прывялі першакласнікаў, быў прасторны, светлы, на першым паверсе. А іх, разгубленых хлопчыкаў і дзяўчынак, было шмат. І ўсе прыйшлі сюды вучыцца. Пабачыўшы разам столькі дзяцей, у асноўным незнаёмых, з суседніх вёсак, Валодзька падумаў, што яму разам з імі будзе цікава. А яшчэ ў яго падняўся настрой, калі ў сваім класе пабачыў суседку Аленку. Непадалёк ад яго сядзеў Колька, з якім пасябраваў даўно. Яго мама таксама працавала на ферме, толькі ў першай адрыне, дзе былі вялікія і грозныя быкі. А яшчэ праз парту — Валерка, яго мама была даяркай.

Увогуле, аказалася, што ў Валодзькі ў школе нямала знаёмцаў. Што ж, вырашыў ён, калі ўсе дзеці ходзяць сюды вучыцца, то і ён паглядзіць, можа, і яму спадабаецца!

Настаўніца ў іх была немаладая, не з іх вёскі. І вельмі строгая. Валодзька спачатку нават баяўся зірнуць на яе. Асабліва тады, калі яна праходзіла паміж радамі парт і трымала ў руках вялікую драўляную лінейку.

«А што, калі яна будзе біць гэтай лінейкай?» — увесь час думаў ён, і ад страху сціскаўся, калі яна праходзіла побач з ім. Ён не памыліўся — настаўніца ўвесь час, нагадваючы дзецям, што трэба выпрастаць спінкі, дакраналася ёю да вучня, які гарбаціўся і паляпвала ёю яго па спіне.

Аднойчы на ўроку пісьма хтосьці з хлапчукоў на апошнім радзе замест палачак у сшытку намаляваў хатку, дык настаўніца моцна раззлавалася і балюча стукнула таго лінейкай па пальцах. І хлопчык заплакаў. Усе прыціхлі, стараючыся выконваць тое, што казала настаўніца. А Валодзька з гэтай пары палічыў яе злоснай. І тады ён даў сабе слова: калі яна і яго ўдарыць, ён не будзе плакаць, як той яшчэ незнаёмы яму хлопчык, а ўцячэ са школы. Але, на шчасце, у яго ўсё атрымлівалася, а дома яму дапамагалі сёстры, і

настаўніца часам хваліла яго. Неўзабаве Валодзька ўжо чытаў лепш за ўсіх у класе.

Хутка прабег першы год вучобы Валодзькі ў школе, а за ім наступілі вакацыі... Час ішоў: другі, трэці клас... А страх перад настаўніцай не сыходзіў. І не дарэмна. Настаўніца па-ранейшаму была строгай, нават злоснай. Яна, калі што не так, усіх без разбору балюча круціла за вушы і ставіла ў кут. І Валодзьку — таксама. Найчасцей за паводзіны, калі ён сваволіў на перапынку, ці забываўся на ўроку, што гэта ўрок, тады злосная настаўніца падыходзіла да яго, ён ручкамі закрываў свае вушы, але гэта не дапамагала — яе рукі былі моцныя і бязлітасныя...

* * *

Гэта здарылася ў чацвёртым класе і запомнілася яму на ўсё жыццё...

Валодзька няўважліва зрабіў хатняе заданне па матэматыцы, а дома яго надта ніхто не кантраляваў, бо вучыўся ён нядрэнна і за вучобу настаўніца ніколі яго не карала і не скардзілася бацькам. (За паводзіны яму па-ранейшаму часта пападала: і куток, і лінейка па руках, і лупцоўка ад бацькі...) Калі ж на наступны дзень настаўніца праверыла сшыткі, аказалася, што з усяго класа толькі ў Валодзькі двойка.

Яна накрычала на яго, абазвала гультаём, сказала, каб дзеці больш не бралі з яго прыклад і не сябравалі з ім, бо ён няправільна зрабіў хатняе заданне, і загадала застацца за гэта пасля ўрокаў.

Валодзька стаяў за партай, і адчуваў, як пачырванеў, а на лбе выступіў пот.

Калі настаўніца падышла да яго і ўхапіла за вуха, стала балюча круціць, ён заплакаў:

— Баліць!

— Вытрымаеш! Ідзі ў куток!

Калі рука адпусціла яго вуха, ён адскочыў ад настаўніцы, нібы ашпараны:

— Вам ніхто не даў права біць дзяцей! Сваіх біце! І ну вас з вашай школай... Самі рашайце гэтыя задачкі!

Ён так рэзка схапіў партфель, які бярог ужо ажно з першага класа, што адарваў ручку і са слязьмі, што засцілі вочы, кінуўся з класа. Валодзька не чуў, як настаўніца крычала яму ўслед, каб без бацькоў заўтра ў школу не вяртаўся. Яму было ўсё адно, што будзе заўтра. Ён ужо вырашыў: у школу больш не пойдзе! Адназначна і беззваротна! Будзе хадзіць і дапамагаць маме на ферме, тым больш, што ён у яе застаўся адзін памагаты: брат пайшоў служыць у войска, сёстры амаль адначасова з'ехалі вучыцца ў Мінск, а ён застаўся адзін у вялікай хаце з мамай і татам.

Тады быў цёплы восеньскі дзень. Дома ад крыўды Валодзька закінуў партфель на лаву, пераапрануўся і, схапіўшы на стале мамінага печыва — сухарыкаў, а з этажэркі кніжку казак, пайшоў у лес, дзе звычайна збіраў з бабуляй грыбы. Там, усеўшыся пад дубам, чытаў казкі, еў сухарыкі і думаў, чаму ў школе дазволена караць дзяцей. Чытаеш у кніжках пра іншыя школы — там такога няма, там усё добра і цікава, а тут... «Вось вырасту, — думаў Валодзька, — буду пісаць зусім іншыя кніжкі, пра тое, як было і ёсць у школе, у якую ўжо ніколі не вярнуся, хай іх прачытаюць начальнікі настаўнікаў і забароняць караць дзяцей. А так, мабыць, начальнікі тыя і не ведаюць, таму настаўніца і распускае рукі...»

Пад вечар Валодзька, упэўнены ў тым, што сваімі кнігамі выратуе дзяцей, якіх караюць настаўнікі, вярнуўся дадому. Тут яго ўжо чакала мама. Па яе суровым выглядзе ён зразумеў, што яму сёння перападзе… Аказваецца, настаўніца, задаўшы дзецям самастойнае заданне, пабывала на ферме і паскардзілася, што Валодзька самавольна збег са школы. Мама не стала разбірацца ці вінаваты сын і сеткай адхвастала яго:

— *Я табе пакажу! Прыдумаў, не буду хадзіць у школу і слухаць настаўніцу!* — прыгаворвала яна.

Валодзьку было балюча і крыўдна, ён моўчкі плакаў, слёзы цяклі па шчоках, але ён скарыўся:

— Бі і ты! Не буду туды хадзіць! Яна злосная, вушы адрывае, абзываецца яшчэ, па руках б'е... Хай сваіх дзяцей лупцуе!

— Не, ты зараз жа дастанеш сшыткі, кнігі і зробіш усе ўрокі! І заўтра пойдзеш, папросіш у настаўніцы прабачэння...

— Не буду! Яе ніхто ў школе не любіць, гэтую настаўніцу. Я не хачу ў яе вучыцца... — Валодзька нарэшце вырваўся з рук маці і збег да бабулі: яна ніколі не дазваляла караць свайго любімага ўнука.

Але бабуля Ганна паўшчувала:

— Ну, Валодзька, ты ўжо вялікі, і сам вінаваты — урок няправільна зрабіў. Ну, і знерваваў настаўніцу, яна не стрымалася...

— Ага, яна гатовая была мяне забіць...

— Ну, яна ж дабра вам усім жадае, — пагладзіла па галаве ўнука бабуля. — Нясі свае падручнікі, рабі ўрокі ў нас. Я з мамай пагавару, каб не лаялася і за сетку больш не хапалася...

Валодзька паслухаў бабулю. Ён сапраўды ўжо дарослы, як не сорамна яму так сябе паводзіць, засмучаць маму і ўсю сям'ю. Праўда: ён застаўся ўжо адзін з бацькамі і павінен быў дапамагаць ім, а не хваляваць.

Настаўніцу Валодзька трываў, не лаяўся з ёй. Але і прабачэння не прасіў у яе: пасля гэтага яна перастала біць дзяцей і цягаць іх за вушы. Ён паспяхова скончыў пачатковую школу. Наперадзе ў яго было шмат цікавага ў жыцці, але першыя ўспаміны дзяцінства былі і горкія, і цёплыя, і сумныя і радасныя… Яны заўсёды асаблівым цяплом грэлі яго душу.

Адно толькі ён не разумеў і не разумее цяпер, напісаўшы шмат кніг: як можна біць дзяцей і пры гэтым жадаць ім дабра…

* * *

Прамільгнула лета. Валодзька пайшоў у пяты клас. Аднойчы новая настаўніца, а ў пятым класе іх ужо было некалькі, па батаніцы задала хатняе заданне: кожнаму дома зрабіць гербарый з «падручнага» матэрыялу і прынесці ў школу. Настаўніца была маладая і добрая, і Валодзьку так захацелася здзівіць яе, што ён доўга не мог заснуць. Круціўся да паўночы, так і не вырашыўшы, з якога матэрыялу яму выканаць хатняе заданне? Ён абшукаў усю хату, але нічога цікавага не знайшоў. Жылі яны бедна, грошай, якія зарабляў бацька ў лесе, не хапала, маці пастаянна лапіла сыну штонікі, і толькі нядаўна на вокны пашыла фіранкі з крамнага таннага матэрыялу. Валодзька спытаў яе:

— Мам, можа ў цябе ёсць які-небудзь кавалачак прыгожай тканіны з кветкамі?

— Адкуль, сынок. Ты ж бачыш, у нас нічога каляровага няма, толькі вось сукенка ў мяне выхадная ды дзве хусткі... — з сумам у вачах адказала мама Жэня. — А навошта табе, Валодзька?

— Гербарый трэба зрабіць у школу, а ў мяне нават фарбаў сваіх няма...

— Трэба дзяўчынак папытаць, можа, у Мінску табе купяць, — паабяцала маці.

І тут Валодзька ўспомніў, як аднойчы, калі ён ляжаў на падлозе ў дзедавай хаце і глядзеў тэлевізар «Зорка-2», бабуля дастала з самаробнай шафы нейкі скрутак і паказала маме — прыгожая белая тканіна ў буйныя ружовыя кветачкі, а таксама — дзве featuresнакаляровыя хусткі.

— Жэня, — сказала бабуля Ганна. — Паглядзі сюды. Тут усё я на смерць сабе сабрала. У гэта мяне і апранеце...

— Мама, вы што такое кажаце?.. — засмучаным голасам ціха прамовіла маці.

— Ты слухай ды запамінай. Я больш паўтараць табе не буду... — строга на гэта адказала бабуля Ганна і працягвала: — У гэтую сукенку мяне апранеце, і ў гэтую чорную спадніцу. Побач пакладзяце ў труну пераменку. Туфлі і новыя тэпцікі там унізе ў скрынцы сабраны. На ніз труны высцелеце палатно. Я яго яшчэ са сваёй маці ткала. А па палатне высцелеце гэтым матэрыялам, тут метраў пяць яго будзе. Буду ляжаць у кветачках. А вось гэту вялікую хустку паверх апранеш, глядзі, Жэнька, не памыліся...

Валодзька так ясна ўявіў тую гутарку бабулі і мамы, якая тады яго вельмі здзівіла: як так?.. Хіба яго любая бабуля можа памерці? Гэтага не можа быць!.. І ён прыдумаў: а калі ён адрэжа кавалачак ад бабулінай тканіны, можа, яна тады ніколі не памрэ?..

Напрасіўшыся ў бабулі паглядзець тэлевізар (дзед купіў яго першым у вёсцы, і па вечарах у яго ў хаце збіраліся суседзі, каб паглядзець кіно), дачакаўшыся, калі яна пайшла спраўляцца па гаспадарцы, Валодзька здзейсніў намер. Узяў з шафы той самы скрутак, і нажніцамі як можна раўней адрэзаў зусім невялічкі кавалачак тоненькай тканіны, у цэнтры якога красаваліся некалькі прыгожых, але невядомых яму кветак.

Калі бабуля вярнулася ў хату, Валодзька выключыў тэлевізар і выйшаў ёй насустрач:

— Пайду рабіць урокі, па тэлевізары няма нічога цікавага...

— Ідзі, унучак, ідзі... — усміхнулася яму бабуля.

Кветкавы гербарый у Валодзькі атрымаўся на славу. Настаўніца яго пахваліла і паставіла пяцёрку. Але радасць ад гэтай ацэнкі неўзабаве скончылася, калі ён прыйшоў дамоў, дзе ўжо яго чакала мама.

— Ты што ж гэта, паразіт, нарабіў?! Навошта матэрыял бабулін сапсаваў? — Яна схапіла яго за вуха і балюча адхвастала ўсё той жа сеткай, у якой прыносілі з крамы хлеб.

— А чаго яна паміраць сабралася? Хай жыве... — сказаў Валодзька, чым яшчэ больш раззлаваў маці.

Але нечакана на выратаванне свайму любімаму ўнуку прыйшла бабуля, пачуўшы крык у хаце.

— Здурнела, дзеўка? Не палохай дзіця!.. На смерць яшчэ расстараюся. Я ж пакуль не збіраюся паміраць.

Яна адвяла хлапчука да сябе, пачаставала салодкімі, яго любімымі налісніками.

Дзед, убачыўшы замілаванне бабкі і ўнука, пажартаваў:

— Малайчына, смяротнае сапсаваў табе. Цяпер жыць будзеш доўга, старая...

— Ну, значыць, пажыву яшчэ, калі ўнук таго жадае... — усміхнулася бабуля.

* * *

Тая лютаўская раніца была звычайнай, як і папярэднія. Праўда, мама крыху раней вярнулася з працы і збіралася ў бальніцу ў райцэнтр праведаць бацьку, куды ўчора вечарам яго хуткая дапамога забрала. Мама вельмі перажывала. Сказала Валодзьку, што тату стала дрэнна ўчора яшчэ на працы — ён працаваў лесарубам у лясніцтве. Але яго чамусьці пасля працы работнікі лясніцтва прывезлі не дахаты, а да ягонай маці, бабулі Вольгі.

Калі яна прыйшла да бацькі, ён скардзіўся, што вельмі моцна баліць жывот. Мама пабегла ў калгасную кантору і патэлефанавала ў бальніцу… І вось раніцай, калі мама ўжо апранала зімовую куртку, каб пайсці на прыпынак, на парозе з'явіўся ўсхваляваны дзядзька Іван, калгасны брыгадзір. Камечачы рукамі шапку, сказаў:

— У мяне дрэнная навіна, Ігнацьеўна. Твой Коля — патэлефанавалі з бальніцы — уначы памёр. Мацуйцеся...

На падлогу ўпала сетка, якую мама трымала ў руках, а з яе выкаціліся два антонаўскія яблыкі, якія разам з прыгатаваным для бацькі пачастункам, ляжалі ў ёй. Мама заплюшчыла вочы і заплакала. Валодзька яшчэ не зразумеў, што ў іх хату прыйшла смерць...

У гэты дзень ён не пайшоў у школу: дарослым было не да яго. У хаце з'ўлялася шмат людзей. Гэта былі сваякі. Валодзькаваму брату Колі ў войска і сёстрам Ніне і Наташы ў Мінск, дзе яны вучыліся, адправілі тэлеграмы, і іх яшчэ не было. Валодзька ўсё ніяк не мог уявіць, што памёр тата, і што яго ўжо ніколі не будзе… Мама ўвесь час плакала, яе ўсе суцяшалі, але дарэмна…

Калі на наступны дзень Валодзька пайшоў у школу, на першым уроку настаўніца гісторыі Валянціна Рыгораўна сказала, звяртаючыся да вучняў класа:

— У нашага вучня памёр бацька. Трымайся, Валодзя...

Валодзька зашморгаў носам, вельмі здзівіўшыся, што яна ўпершыню яго так назвала: «Валодзя...», а ўсе аднакласнікі спагадліва паглядзелі на яго. А на перапынку да яго падышоў Колька, з якім ён пасябраваў на ферме (Колька таксама дапамагаў маці, якая працавала там), і сказаў: «Трымайся, Валодзька. Ты зараз сірата. Але я цябе ў крыўду не дам...»

І тады Валодзька зразумеўшы, што ён зараз не такі як усе — сірата, горка, нікога не саромеючыся, заплакаў… І гэтае слова ён зненавідзеў на ўсё жыццё...

На могілкі Валодзьку не ўзялі. Бабуля Ганна сказала, што дзецям там рабіць няма чаго…

Са смерцю таты скончылася Валодзькава дзяцінства. І не таму, што ён падрос, не таму, што ля хаты шмат было працы — без яго дапамогі маці, бабуля і дзед маглі абысціся. Проста ён зразумеў, што ранейшага Валодзькі — бестурботнага, вясёлага выдумшчыка, часам неслуха і неразумнага дзіцяці — больш няма… Цяпер ёсць іншы Валодзя. І ён ужо жыве не тым дзіцячым жыццём, якое прынесла яму нямала і радасці і горычы, і сяброў і недругаў, а тым дарослым жыццём, якім яму жыць і жыць…

Ён любіў сваю маці, дзядулю і бабулю, брата і сясцёр, якія неўзабаве стварылі свае сем'і, любіў сваю вёску і сваю родную хату, свой стары сад, прылесак Бярознае, яркае палескае сонца, дажджы і залевы, спякоту і халады…

Ён заставаўся рамантыкам, нягледзячы ні на што, і марыў стаць пісьменнікам, і стаў ім…